

# ПРЫЗБА-фэст

ТЭАТР. ЭКАЛОГІЯ. САЦЫЯЛЬНАЕ МАСТАЦТВА.

## 8-10 ЖНІЎНЯ 2014

## ЗАЛЕССЕ, ВЯЛІКАЕ СЯЛО

ПРЫЗБА ФЭСТ



Прызба (ад "пры ізбе", таксама укр. призьба, рас. завалинка) – збудаванне-насып уздоўж вонкавых сцен па перыметры драўлянага дома або лазні для абароны хаты ад холаду і сырасці. Гэта можа быць і звычайны земляны насып уздоўж сцен.
Найбольш простая прызба – прысыпка зямлёй ці пяском двух ніжніх вянцоў. Больш дасканалая і пашыраная - з калкоў, убітых у зямлю на адлегласці каля сарака сантыметраў ад сцяны і пераплеценых лазой або бярозавымі пруткамі, ці з укапаных слупкоў, за якія закладвалі тонкае бярвенне, дошкі. Рабілі прызбы і з укапаных слупоў з пазамі, у якія закладвалі бярвенне. Прызбы былі невысокімі, але часам іх насыпалі і да акна. Засыпалі іх зямлёй, пяском або кастрыцай.
Цяпер дамы ставяць на падмурку і прызбы не робяць, а гэтым словам называюць проста лаўку, што стаіць пад хатай.

(з Вікіпедыі)

Яшчэ адно прызначэнне прызбы – быць месцам збору і размоваў суседзяў. Месцам, дзе абмяркоўвалі навіны і праблемы – ад сельскіх да сусветных. Месцам камунікацыі і гарачых спрэчак. Месцам для ўласных гісторый, апавядаў, песень...

Што будзе на нашай "Прызбе"?

**Сацыяльнае мастацтва.** Выхад мастака да публікі, да "выключаных" людзей, магчымасць даць права голасу людзям, якіх ніхто не чуе, рэфлексія і праца з важнай праблематыкай… Чаму мастак выходзіць за межы студыі, тэатральнай залы? Што прымушае яго працаваць з недзеяздольнымі людзьмі, цяжкімі падлеткамі, старымі з дому састарэлых? Чаму, часам з рызыкай для ўласнай бяспекі, мастак працуе з палітычнай, грамадскай праблематыкай? Ці павінна мастацтва быць сацыяльным?



**Экалогія.** " Усе пакуты, усе беды і гвалт, якія людзі чыняць адно аднаму, абвальваліся да гэтага часу на "іншых": габрэяў, чорных, жанчын, палітычных імігрантаў, дысідэнтаў, камуністаў і г.д. З аднаго боку, існавалі загароды, лагеры, гарадскія кварталы, ваенныя блокі, з іншага – уласныя чатыры сцяны – рэальныя або сімвалічныя межы, за якімі маглі схавацца тыя, каго, здавалася б, не кранула бяда. Усё гэта мы маем па-ранейшаму – і ўсяго гэтага ўжо няма па Чарнобылі, - піша нямецкі сацыёлаг Ульрых Бек, - Чарнобыль – гэта канец "іншых"... Ад беднасці можна абараніцца межамі, ад небяспекі атамнага веку – нельга". Змяненне клімату, забруджванне мірным атамам, ГМА… Ульрых Бек мае рацыю, ад усяго гэтага ўжо не схаваеш галаву пад падушку. І ад экалагічных пагроз цяпер ужо не ўратуюць ані статус, ані грошы, ані тоўстыя муры. Мы паспрабуем паразмаўляць аб гэтым падчас Прызбы.

**Нефармальная адукацыя.** Мы хочам вынесці адукацыю з закрытых акадэмічных колаў у публічную прастору і зрабіць яе даступнай для як мага большай колькасці людзей. Лекцыі пад адкрытым небам на "Прызбе" – гэта новы фармат нашай адукацыйнай платформы, што пачала працаваць у Брэсце ў красавіку 2013-га. Да ўдзелу ў "Прызба-фэсце" мы запрасілі людзей, якія нам падаюцца важнымі і значнымі ў кантэксце беларускага культурнага поля. У дадатак будзе файная магчымасць для ўсіх ахвотных узяць удзел у ранішніх майстар-класах.

**Кіно і музыка.** Вучыцца і гаварыць на сур'ёзныя тэмы ў цудоўным прыродным месцы можна, але не бясконца. Увечары і ўночы мы маем намер адпачываць і забаўляцца. Мы будзем глядзець кіно пад адкрытым небам з КІНЕМО і слухаць самую розную музыку. У рэшце рэшт, гэта ж лета!

**Вялікае Сяло.** Спачатку было шчаслівае знаёмства з хлопцамі з Залесся, а потым размовы пра "Прызба-фэст", якія цягнуліся больш за год. Мы спрачаліся аб тэмах фэста, аб канцэпце, аб удзельніках… У пэўны момант я пачала перагараць, і "Прызба" стала здавацца чарговай імпрэзай, куды прыедзе знаёмая тусоўка для прыемнага баўлення часу і спажывання якаснага культурнага прадукту.
Але раптоўна ў нейкае імгненне з'явілася думка зрабіць нешта для людзей тутэйшых, далучыць іх да ўдзелу, пакінуць свой след на сяле, , зрабіць культурны "бартэр". Гэта ўжо давала натхненне, але пакідала пытанне: як прыйсці да людзей, для якіх мы – чужыя?
Ідэя сабраць гісторыі гэтых мясцін і разам з тутэйшымі дзецьмі (а ў дзяцей устаноўкі "чужынскасці" не маюць такой моцы) зрабіць спектакль, здаецца мне тым мастом, які можна пракласці паміж тутэйшымі і прыезжымі, гарадскімі і вясковымі, мастом, дзе можа пачацца дыялог.
10 жніўня мы запрашаем усіх на Дзень Вялікага Сяла – не афіцыйнае мерапрыемства з загаданай "зверху" праграмай, а ўласнаруч арганізаванае свята суседзяў, у якое кожны можа зрабіць свой унёсак. Мы рыхтуем спектаклі і адкрыты майстар-клас традыцыйнага танцу ад вясковага тэатра "Венгайты", а таксама вялікі, накрыты агульнымі намаганнямі стол.

Аксана Гайко
Тэатр "Крылы халопа"



ПРЫЗБА- ФЭСТ: ТЭАТР. ЭКАЛОГІЯ. САЦЫЯЛЬНАЕ МАСТАЦТВА.



**8 жніўня 16.00**

**Дар'я Яскевіч: прэзентацыя "Дэвіянтнае мастацтва ў інтэрнатах Беларусі" з удзелам мастакоў групы «Арт" Ну-во! "з псіханеўралагічнага дома-інтэрната № 3 г. Мінска.**

Дар'я Яскевіч - арт-тэрапеўт, арганізатар мастацкай майстэрні "Дом", куратар выстаў беларускага дэвіянтнага мастацтва і праекта "Art "Ну-во!", адзін з куратараў фэстывалю інтэграваных тэатраў "OneDay", арганізатар рэабілітацыйных арт-тэрапеўтычных пленэраў і лагераў для людзей з асаблівасцямі і без.
Псіхолаг псіханеўралагічнага дома-інтэрната. Цалкам нармальны чалавек.

З інтэрв'ю з Дар'яй: "...уявіце: чалавек усё жыццё асуджаны на сацыяльную депрывацыю. Ён штучна выняты з грамадства і змешчаны ў невялікую, вельмі сумнеўнай якасці субкультурку. Свабоды выбару няма, усё жыццё рэгламентавана з 6.30 раніцы да 21 гадзіны. Нейкая ілюзія волі можа быць ноччу, калі функцыі нагляду выконваюцца слабей і можна падгадаць момант і зрабіць што-небудзь, прычым не заўсёды добрае, тым самым выплюхнуўшы сваю энергію. І раптам з'яўляецца нейкае месца, дзе ты можаш пабыць сам сабой, - гэта ілюзія, але ўсё-такі ілюзія волі, дзе ты валодаеш нейкай каштоўнасцю, ты можаш быць патрэбным і карысным, а не проста існуеш як адзінка ледзь не ў вопісу маёмасці.
...Сама майстэрня стала вялікім, развітым арганізмам, які ўключае 20 чалавек...і ў чалавека раптам з'яўляецца жыццё. Жыццё не паталагічнае, якое было да гэтага, ад званка да званка, з агрэсіяй, а жыццё дастойнае."






**8 жніўня 20.30**
**Дыскусія "Ці павінна мастацтва быць сацыяльным?"**

Мадэратар: Вольга Шпарага.

Вольга Шпарага – філосаф, рэдактар інтэрнэт-часопіса «Новая Еўропа», дацэнт ЕГУ. Аўтар манаграфіі «Абуджэнне палітычнага жыцця: Эсэ пра філасофію публічнасці» (Вільнюс: ЕГУ, 2010). Сфера цікавасцяў: фенаменалогія і палітычная філасофія, еўрапейская прастора і месца Беларусі ў ёй, сучаснае мастацтва.





**9 жніўня 14.00**
**Прэзентацыя аграэкасядзібы Залессе**

Вёску Залессе даўно ў вузкіх колах клічуць "савінай" з-за яе размяшчэння: на ўскраіне найбуйнейшага нізіннага балота Дзікае, якое прымыкае да лесу нацыянальнага парку Белавежская пушча. У вёсцы можна проста з парога назіраць 6 відаў соў. Наогул у Белавежскай пушчы гнездуюцца 9 савіных відаў. Адна з іх, барадатая кугакаўка, стала сімвалам Залесся. Гэта нядзіўна, бо менавіта тут адзначаны адзін з арэалаў пражывання гэтага віду савіных…
Старонка Залесся www.zalessie.by

ПРЫЗБА- ФЭСТ: ТЭАТР. ЭКАЛОГІЯ. САЦЫЯЛЬНАЕ МАСТАЦТВА.





**Тэатр "Венгайты" (Польшча)**

З'яўленне вясковага тэатра "Венгайты" ў 1986 годзе мела асаблівы сэнс у палітычным кантэксце таго часу. Першыя дасягненні тэатра былі прадвесцем адраджэння грамадскага жыцця і дэмакратычных рэформ. Гэта быў "час культуры". Характэрнай рысай першых артыстычных выступленняў "Венгайтаў" было іх новае стаўленне да традыцыі. З аднаго боку, выкрывальнае і адмаўляючае стэрэатыпы і клішэ эпохі сацыялістычнай ПНР. З іншага боку, не менш важкім стала тое, што "Венгайты" адлюстроўвалі свет шматэтнічнай і мультыкультурнай традыцыі. "Гісторыі Вінсэнта", "Карчма да вечнага спакою", заснаваная на "Даліне Ісы" Чэслава Мілаша, звярталіся да маладога пакалення, да людзей, што прыступалі да стварэння новых грамадскіх інстытутаў у рэгіёнах Вармії і Мазураў. Часткаю гэтага працэсу была барацьба за афіцыйнае прызнанне тэатра ў Венгайтах – ён узяў сабе назву вёскі, у якой базуецца – і забеспячэнне належнага статусу.
Першыя спектаклі "Венгайтаў" шмат каго ўразілі на тэатральных фестывалях у Польшчы і за яе межамі. У іх заўважалі элементы новай "вясковай" плыні ў польскім тэатры. Іх успрымалі ў кантэксце актуальных зменаў у Цэнтральнай Еўропе, тым больш, што апроч спектакляў, тэатр таксама прадстаўляў дакументацыю сваёй даследчыцкай работы ў такіх краінах, як Беларусь, Македонія, Славакія і Украіна. Гэта былі пошукі ў сферы народнай песні і тэатра абраду. Кульмінацыяй гэтага этапу дзейнасці стаў Гран-пры, які тэатр атрымаў на міжнародным фестывалі ў Цешыне ў 1993 годзе.
Шматэтнічная мазаіка тэатральных сродкаў, што выкарыстоўваў тэатр – прызнак стылю, выпрацаванага "Венгайтамі". Аднак у сярэдзіне дзевяностых з'явіліся новыя выклікі. Адбыліся змены ўнутры тэатра. З таго моманту работа "Венгайтаў" праводзілася ў двух напрамках: "Scholi", пад кіраўніцтвам Вольфганга Ніклауса і "Праекту мясцовага" (Project Terenowy) пад кіраўніцтвам Вацлава Сабашэка. " Schola" пачала працаваць над рэканструкцыяй літургічнай драмы. "Праект мясцовы" працуе ў вобласці жывых формаў абраду, як сродку натхнення для тэатра. Група стварыла спектаклі, асновай якіх былі фінскі эпас "Калевала" (2000), "Дзяды" Міцкевіча (2002), "Вяселле" і "Транс-Атлантык" Вітальда Гамбровіча.
Тэатр прадстаўляў сваю дзейнасць на тэатральных і экалагічных фестывалях у Польшчы, Германіі, Чэхіі, Расіі, Венгрыі, Швейцарыі, Іспаніі.
З 2000 года "Праект мясцовы" арганізуе цыкл майстар-класаў і тэатральных экспедыцый ў межах праекту "Іншай школы тэатральнай". З 2003 года арганізуе фестываль "Тэатральная вёска".

Старонка тэатра http://www.teatrwegajty.art.pl/



**8 жніўня 17.30**

**Прэзентацыя дакументацыі «Вытокі і будучыня» і «Караван поўдня» пра экспедыцыю тэатра "Венгайты" ў Албанію.**

...У Албанію нас запрасілі для наведвання людзей з вёскі Загаю каля возера Шкадэрскага, якое аддзяляе Албанію ад Чарнагорыі. Нашыя партнёры, Юстына Вельгус да Іллір Драгавая, падрыхтавалі там фільмавы дакумент пра жорсткі час гісторыі албанскай вёскі і яе жыхароў, якіх ужывалі дзеля мэт камуністычнага рэжыму для пільнавання мяжы. Усталяванне кантакту з жыхарамі Загаю атрымалася для ніх вельмі цяжкім. Мэтай нашага побыту ў вёске была спроба ўсталявання дыялогу і развязванне заблакаванай камунікацыі з дапамогай тэатральных сродкаў. У нас атрымалася дасягнуць гэтую мэту нечакана і прама. Пасля тыдню тэатральных рэпетыцый і візіта да жыхароў Загаю мы знайшлі тэатральны знак, досыць моцны каб супрацьстаяць мясцоваму табу на размовы пра траўматычнае мінулае вёскі, пра мноства спроб уцячы да Чарнагорыі ўплыў праз возера, шмат з якіх заканчвалася трагічна.
На беразе возера мы паказалі спектакль "Зямля Б", у якім была сцэна, дзе дзяўчына ўваходзіць у ваду і плыве ў бок мяжы...

**10 жніўня 17.00 (клуб Вялікага сяла)**

**Спектакль "Зямля Б"**

Цёмна-сіняя бездань вока быка нібы люстра,
у якім мы бачым сябе як ажыўшае мяса...
(Анджэй Стасюк, «Па дарозе ў Бабадаг»)

Пасыл:
Большасць людзей мяркуе, што мы не павінны сеяць паніку, таму што заўжды будзе выйсце. Нехта верыць, што нават калі сённяшнія паводзіны чалавека знішчаць жыццё на Зямлі ў будучыні, то заўсёды будзе магчымасць пераляцець на Марс ці на іншую планету.
Нават калі б мы і хацелі застацца ўбаку, нажаль, на нашых вачах фармуецца тая, іншая, горшая Зямля. Тут і цяпер.

Форма:
Сцэны выбудаваныя адпаведна тэхніцы калажу, адпаведна паранойдна – крытычнаму метаду Сальвадора Далі.

Тэксты:
Эдвард Стахура, Бертольд Брэхт, Канстанты Ільдэфонс Галчынскі, Бетка Вольны, Давід Зялінка, Паўліна Міу Зялінска, Вей Ю Лін- Гарэцка.

Пастаноўка:
Вацлаў Сабашэк

Акторы:
Моты Ашкеназі, Зафія Барташэвіч, Іза Гічэўска, Эмілія Хагельганц, Эрдмутэ Сабашэк, Вацлаў Сабашэк, Барбара Шпунэр, Паўліна Міу Зялінска.

Прэм'ера:
25 красавіка 2011 года, «Дзядувэк» ля возера Ханьча

ПРЫЗБА- ФЭСТ: ТЭАТР. ЭКАЛОГІЯ. САЦЫЯЛЬНАЕ МАСТАЦТВА.

**Фестываль КІНЕМО – першы ў Беларусі open-air фестываль нямога кіно і сучаснай музыкі. Арганізаваны праектам Cinemascope і Асацыяцыяй маладых беларускіх кампазітараў у 2013 годзе ў г. Мінску. Ідэя фестывалю - паказ класічных, але невядомых шырокай публіцы фільмаў, якія агучваюцца сучаснымі прагрэсіўнымі музыкамі і кампазітарамі.**





**8 жніўня 22.30**
**МАЯ БАБУЛЯ I Chemi bebia**
СССР (Грузія), 1929, 65 хв.
Рэжысёр: Котэ Мікаберыдзэ
Музычнае суправаджэнне – Канстанцін Яськоў
Апавяданне пра пошук "бабулі", то бок «калматай рукі», якая «закіне слоўца» і выб'е добрую пасаду – вострая сатыра на новую бюракратычную сістэму. У свой час фенаменальны рэжысёрскі дэбют актора Котэ Мікаберыдзэ не быў ацэнены належным чынам. Карціна легла «на паліцу» і з забыцця яе вярнулі толькі ў 1970-я гады.
Буйная рэжысёрская фантазія літаральна пырскае з экрану. Акрамя шматлікіх трукаў, гэгаў, чыста кінематаграфічных сродкаў, Котэ Мікаберыдзэ выкарыстоўвае маляваную і аб'ёмную мультыплікацыю.

**9 жніўня 23.00**
**АНТРАКТ I Entr'acte**
Францыя, 1924, 20 хв.
Рэжысёр: Рэнэ Клер;
Музычнае суправаджэнне – Five-storey ensemble;
10-хвілінны фільм-эсэ «Антракт» прапануе гледачу трапіць у свет дзіўных сюррэалістычных вобразаў са зборніка "Анталогія сюррэалізму". У кадры з'яўляюцца многія актыўныя ўдзельнікі авангардысцкага руху: Франсіс Пікабіа, Ман Рэй, знакаміты мастак Марсэль Дзюшан, а таксама кампазітары Жорж Орык і Эрык Саці. «Антракт» цалкам вытрыманы ў духу дадаісцкага абсурду - ніякага сюжэту, зрынутая на зямлю літаратурнасць, прыгажосць, але бессэнсоўны рух прадметаў і персанажаў.

**«Вандроўка на Месяц» / Le Voyage dans la Lune**
Францыя, 1902, 14 хв.;
Рэжысёр: Жорж Мельес;
Музычнае суправаджэнне – Five-storey ensemble;
Першы навукова-фантастычны фільм у гісторыі кінематографа. Кароткаметражная фарсавая камедыя, якая парадуе сюжэты раманаў Жуля Верна «З гарматы на Месяц» і Герберта Уэлса «Першыя людзі на Месяцы». Пастаўленая рэжысёрам Жоржам Мельесам па ўласным сцэнары, на створаных ім дэкарацыях, на яго прыватнай студыі і сіламі ягонай акторскай групы.

**10 жніўня 23.00**
**Кароткаметражкі Бастэра Кітана.**
Іграюць ўдзельнікі майстар-класу «Тапёрства» + усе ахвотныя музыкі!



**9 жніўня 15.30**
**Жанна Панамарэнка: лекцыя «Дыскурс улады ў сучасным мастацтве»**

Мастацтва - спосаб камунікацыі, у тым ліку - дыялогу паміж уладай і грамадствам. На якіх прынцыпах будуецца гэты дыялог? Ці змагаецца мастацтва за ўладу? Што гэта азначае -сацыяльнае мастацтва? Утопія сацыяльнага мастацтва: ад рускага авангарда да сучаснасці.

Жанна Панамарэнка - з 2001 года займаецца актывістскай ды праваабарончай дзейнасцю. З 2006г. займаецца праектнай працай на базе грамадскай арганізацыі "Гуманістычны рух моладзі" (Мурманск). Тэматычная вобласць праектаў - узаемадзеянне ўлады і грамадства, сацыяльнае мастацтва і арт-актывізм, гендэр, сацыяльнае развіццё горада, працэс-арыентаваныя метады ў праектнай працы.
Галіна навуковых інтарэсаў: сацыяльна-палітычнае мастацтва, сацыяльныя пратэсты і самаарганізацыя ў гістарычнай перспектыве. З лістапада 2013 з'яўляецца членам грамадскай назіральнай камісіі ў месцах пазбаўлення волі Мурманскай вобласці. Сярод арганізаваных праектаў: Міжнародны фестываль "Дыялог культур" (праходзіў у Мурманску з 2004 па 2011 гг.) ; адукацыйная акадэмія "Усход-Форум" (праходзіць у Мурманску з 2006 г.); фестываль сацыяльнага развіцця гораду "Урбан-фэст" (Мурманск, чэрвень 2014); канферэнцыі на розныя сацыяльныя тэмы ("Жанчына / рэвалюцыя / эмансіпацыя / фемінізм ", Санкт-Пецярбург, 2013; "Стратэгіі ізаляцыі і выключэння", Мурманск, сакавік 2014).



**9 жніўня 17.30**
**Таня Арцімовіч: лекцыя "Гвалтам на гвалт, альбо Мастацтва з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй"**

Новая драма ці новая п'еса зрабілася ўжо неад'емнай часткай сучаснага тэатру. Паўстаўшы на постсавецкай прасторы ў сярэдзіне 1990-х, канчаткова гэты драматургічны феномен акрэсліўся ў пачатку новага тысячагоддзя і легалізаваўся ў канцы "нулявых".
Творы навадрамаўскіх аўтараў розныя. „Жывёліна" Юлі Шаўчук не падобная да „Замкнёных дзвярэй" або „Трох дзён у пекле" Паўла Пражко, па-рознаму гучаць „Неахіпстары" Вікторыі Біран і „Знешнія пабочныя" Дзмітрыя Багаслаўскага. Аб'ядноўвае гэтыя тэксты правакацыйнасць, неадназначнасць, а таксама сацыяльна актыўная пазіцыя аўтараў, якая ў большай ці меншай ступені выяўляецца ў кожным тэксце.
У якіх умовах нараджалася і сталела новая драма? Што з'яўляецца адметнасцю гэтых тэкстаў? Чаму аўтары ў пошуках тэмы і новых герояў выйшлі на вуліцы? І што стаіць за гіпернатуралізмам новай драмы?
Падчас выступу лектарка будзе звяртацца да творчасці ў асноўным беларускіх аўтараў – Паўла Пражко, Косці Сцешыка, Дзмітрыя Багаслаўскага, Юлі Шаўчук, Максіма Дасько і інш.
**Таня Арцімовіч** - тэатральны рэжысёр, мастацтвазнаўца. Аўтарка шэрагу тэкстаў, прысвечаных сучасным тэатральным практыкам, асабліва ў беларускім кантэксце. Заснавальніца і каардынатарка Платформы перфарматыўных практык «зЕрне» (http://ziernie-performa.net/), рэдактарка вэб-парталу partisanmag.by. Друкавалася ў беларускіх, расейскіх, польскіх, нямецкіх выданнях.

ПРЫЗБА- ФЭСТ: ТЭАТР. ЭКАЛОГІЯ. САЦЫЯЛЬНАЕ МАСТАЦТВА.

### Тэатр "Крылы халопа" (Брэст)

Тэатр "Крылы халопа"(з 2001 па 2011 гг. Свабодны тэатр) - незалежны альтэрнатыўны тэатр. Заснаваны ў 2001 годзе.
На працягу 2001 - 2014 гг. тэатр стварыў 10 спектакляў (у тым ліку 4 вулічныя), якія адрозніваюцца стылістыкай, візуальнай моваи і метадыкай працы над імі. Гэта спектаклі паводле твораў Данііла Хармса, Янкі Купалы, Франца Кафкі і ўласных сцэнараў. Стылістыка спектакляў аб'ядноўвае элементы нямецкага экспрэсіянізму і тэатра Брэхта, традыцыйнага ўсходняга тэатра і клаўнады, пантамімы і дакументальнага тэатра.
Тэатр «Крылы халопа» - адзін з нешматлікіх у Беларусі вулічных тэатраў. У сваіх вулічных спектаклях тэатр злучае прыёмы традыцыйнага вулічнага тэатра (хадулі, маскі, жывы агонь, жывая музыка), элементы хэпенінгу, клаўнады, выразнасць усходняга тэатра і нямога кінематографа.
Тэатр «Крылы халопа» прэзентаваў спектаклі на шматлікіх тэатральных фестывалях у Польшчы, Украіне, Беларусі, Расіі, Даніі.
У 2008 - 2010 гг. тэатр быў арганізатарам Дня вуліцы Падгародскай, дзе на працягу 10 год меў рэпетыцыйную залу. У 2011 годзе тэатр арганізаваў Фестываль альтэрнатыўнай культуры «Культ А» ў Брэсце.
У 2005 - 2008 гг. тэатр удзельнічаў у праектах анімацыі культуры ў Варшаве сумесна з варшаўскім тэатрам Remus. Тэатр працаваў з дзецьмі і падлеткамі ў варшаўскім раёне Прага, у лагеры для чачэнскіх уцекачоў у Ліпіне пад Варшавай, у рэабілітацыйных цэнтрах і з недзеяздольнымі людзьмі. Тэатр арганізоўваў і прымаў удзел у праектах анімацыі культуры ў Беларусі: у дзіцячых дамах (Кобрынскі дзіцячы дом, Дзівінская школа-інтэрнат), з недзеяздольнымі людзьмі з псіханеўралагічнага інтэрната "Навінкі" ў Мінску.
У лютым 2013 года тэатр стаў першым беларускім інтэрнэт-тэатрам (ан-лайн паказ спектаклю "Трусы" па п'есе Паўла Пражко).
З красавіка 2013 года тэатр КХ арганізуе адукацыйную платформу ў Брэсце, у межах якой былі прэзентаваныя лекцыі пра сучаснае мастацтва, тэатр і г.д.
У 2013 г. тэатр пачаў рэалізацыю дакументальнага тэатральнага праекта "Гісторыі Беларусі". Першым этапам стаў "Чарнобыль", другім - "Гісторыі Беларусі. Вялікае сяло".
Старонка тэатра www.teatrkh.com





**8 жніўня 15.30**
**Адкрыццё выставы дзіцячага малюнка на тэму "Чарнобыль"**

У межах праекта "Чарнобыль" у красавіку-чэрвені 2013г. тэатр "Крылы халопа" ініцыяваў конкурс дзіцячага малюнка, прысвечанага чарнобыльскай тэме. Выставы былі арганізаваныя ў ліпені 2013г. у Брэсце пры падтрымцы гатэля HERMITAGE (Брэст) і ў Венгайтах (Польшча) у рамках фэстывалю "Вёска Тэатральна". На сайце тэатра была арганізавана таксама віртуальная выстава.





**9 жніўня 21.00**
**Дакументальны спектакль «Чарнобыль»**

Дакументальны тэатр, заснаваны на сапраўдных тэкстах і дакументах, інтэрв'ю і лёсах рэальных людзей, тэхніцы verbatim, найбольш актуальных і сучасных тэмах навакольнай рэчаіснасці – гэта жанр, што існуе на стыку мастацтва і сацыяльнага аналізу.
Нямецкі журналіст Вольфганг Бюшэр, які прайшоў пешшу ад Берліна да Масквы, называе Беларусь сімвалам усходу Еўропы: "могілкі гісторыі", "кар'ер трагізму", дзе "матэр'ял адно нядаўна зарос травою"... Мы ўсведамляем, што маштаб гістарычных катастроф і трагедый, якія давялося перажыць беларусам, такі велізарны, што гісторыя шмат якіх падзей ператвараецца ў міф, або, наадварот, адбываецца выцясненне балючых момантаў з памяці. У пэўны момант нам падалося важным разуменне і ўсведамленне сваёй гісторыі і сучаснага, а таксама стварэнне ўласнага падручніка сучаснай гісторыі, вызваленага ад ідэалогіі, палітычных матываў і міфалагізацыі.
Асновай для першага спектакля – дакумента "Чарнобыль" сталі матэр'ялы двух экспедыцый у беларускую частку зоны адсялення і Палескі радыяцыйна-экалагічны запаведнік, інтэрв'ю з людзьмі, якіх эвакуявалі па аварыі ў Чарнобылі, дакументы, звязаныя з наступствамі аварыі на ЧАЭС і зонай адсялення, выказванні на форумах, прысвечаных будаўніцтву АЭС у Беларусі. Інтэрнэт-форумы мы вырашылі разглядаць як сучасную драматургію, мова якой пазбаўлена ненатуральнасці і літаратурнасці.
"...Спектакль «Чарнобыль», безумоўна, важны крытычны голас маладога пакалення. Яго задача – абудзіць грамадскую свядомасць і схіліць яе да далейшай размовы аб праблеме, якая, нягледзячы на 28 гадоў, да гэтага часу ўплывае на жыццё людзей у Беларусі. Рэжысёр дае голас людзям, якіх ніхто не пачуе, кажа пра падзеі, якія да гэтага часу не дачакаліся публічных дэбатаў..." (Pawel Wrona, Gazeta Teatralna)
Афіцыйная прэм'ера адбылася ў Познані 7 снежня 2013 года на Міжнародным тэатральным фестывалі "Маскі" пры падтрымцы Інстытута Адама Міцкевіча і тэатра Biuro Podryży (Познань, Польшча).
Спектакль прэзентаваны таксама ў межах Міжнароднага жаночага тэатральнага фестывалю TRANSIT в Odin Teatret (Дания, Хольстебро), фестывалю Wioska Teatralna (Венгайты, Польшча) і на «Урбан-фэсце» (Мурманск, Расія).

Над спектаклем працавалі:
Рэжысёр: Аксана Гайко
Акцёры: Святлана Гайдалёнак, Сяргей Гайко, Аксана Гайко
Рэжысура святла і праекцыі: Ганна Фёдарава, Алена Штык, Зміцер Мартынюк
Гукарэжысёр- Андрэй Багданаў
Дакументальны відэа і фота- матэр'ял: Сяргей Гайко, Аксана Гайко, Андрэй Алексіевіч, Аляксандр Міхальчык
Мантаж відэа: Сяргей Гайко
Відэа-арт, дызайн: Вета Вертэ
Праца з дакументамі, тэкстамі форумаў: Аксана Гайко, Ганна Фёдарава, Святлана Гайдалёнак
Пераклад тэксту: Святлана Гайдалёнак, Марына Заўражная, Саада Архіпава

ПРЫЗБА- ФЭСТ: ТЭАТР. ЭКАЛОГІЯ. САЦЫЯЛЬНАЕ МАСТАЦТВА.



**9 жніўня 19.00**
**Музычны праект «Андарак»: канцэрт**

Свежы праект музыкаў і выканаўцаў гуртоў "Крыві", "Джамбібум" і "Калахары" - адметнае трыо, у складзе якога тры самастойныя музыкі, удзельнікі розных вядомых музычных гуртоў, якія аб`ядноўвае фолькавая тэматыка і любоў да беларускай творчасці.
Насця Хмель ("Джамбібум") — спявачка, мультыінструменталістка і знаўца беларускага фальклору. Жыве ў Францыі.
Раман Цябут ("Дзівасіл") — драмер і перкусіяніст.
Ігар Гарбачэўскі — удзельнік гурта KRIWI, гітарыст, спявак, каардынатар праекту TRY2CRY.



**9 жніўня 24.00**
**Pavel Ambiont & Solar Olga (live A/V set)**

Павел Няхаеў і Вольга Салахеева прадстаўяць на ПРЫЗБА-фэсце свой 'visual techno poetry' сэт. Вольга праілюструе электронную музыку і вершы Паўла жывой візуальнай плынню з матэрыялаў, якія яны разам ствараюць з відэа, фота і кіна-стужак, камп'ютэрнай графікі і беларускай вышыўкі.
З 2011г. Павел і Вольга выступаюць разам на шматлікіх фэстах, выставах і імпрэзах у Беларусі, Літве, Латвіі, Польшчы, Італіі і Іспаніі.

**Solar Olga / Вольга Салахеева**

VJ / лайв-відэа артыстка, медыя-спецыяліст і куратар з Мінска. Атрымаўшы веды ў галіне мастацтва і візуальнай культуры ў Мінску, Санкт-Пецярбургу і Вільні, некалькі год таму занялася лайв-відэа-артам.
"Спалучэнне фотаздымкаў, фрагментаў відэа і кіно дазваляе кіраваць і маніпуляваць рэальнасцямі і эмацыйнымі станамі. Мяне захапляе ненаратыўны кінематаграфічны відэашэраг і A/V перформансы, дзе гледачы могуць больш сканцэнтравацца на ідэі. Я шукаю спосабы стварэння менавіта такога візуальнага асяроддзя."
Для Вольгі VJing - гэта творчасць паміж сузіраннем і дзеяньням, а таксама каммунікацыя з гледачамі і музыкамі. Перавагу яна аддае больш медытатыўным аўдыё-відэа перформансам у галерэях і кінатэатрах, але выступае ў клубным фармаце з музыкамі беларускіх лэйблаў Foundamental Network і Force Carriers.
http://solarolga.com

**Pavel Ambiont / Павел Няхаеў**

Музыка і даследчык культуры. Стварае электронную музыку з 2003. Асноўныя праекты – pavel ambiont, nieviadomy artyst. "Музыка можа маскавацца пад deep techno, electro, dubstep альбо ambient, але важны не стыль, а магічная гіпнатычнасць гукаплыні. Пры ўсёй танцавальнасці музыка мае і больш важную мэту – працаваць з эмацыйнымі станамі."
З 2008 выступіў амаль на 100 імпрэзах і фестывалях у Беларусі, Польшчы, Латвіі, Літве, Венгрыі, Італіі, Іспаніі, ЗША і Расіі. Супрацоўнічае з беларускімі прома-групамі Foundamental Network і Euthanasia. Арганізатар тэхна-лэйбла Force Carriers .
http://pavel-ambiont.com, http://facebook.com/pavel.ambiont

Віка Шчарбакова





**Дзень Вялікага сяла**
**10 жніўня. Вялікае сяло, мясцовы клуб**
Праграма:
**16.00 - Дзіцячы спектакль "Аповеды з Вялікага сяла" на аснове рэальных велікасельскіх гісторый**
"...Якія ўсе былі людзі, такіе добрыя, дабразычлівыя. Пасля вайны былі харошыя людзі. Ой, а як было добра, весела, песні такія харошыя спявалі. А вечарам моладзеж як сабярэцца, спяваюць, аж у другім сяле слышна. А тут о, плачшадака для моладзі была. Як сабяруцца, на гармошках граюць, а дзяўчаты як станууць танцаваці – пыў стаўбом ідзе, так што нічога не відна. Дружна было. А як радыё паявілася, як яно іграла, на ўсю дзярэўню чуваць. На сталпах было яно, і ўжо далеко чуці, як яно іграе, усе радыя былі..."
З сабраных аповедаў пра Вялікае сяло
Гісторыя, якую мы ведаем па падручніках гісторыі - гэта яшчэ далёка не ўся гісторыя. Вельмі часта мы не разглядаем "маленькія" чалавечыя гісторыі, як важныя для разумення гістарычных падзей. Вербальныя, вельмі асабістыя гісторыі часта становяцца адпраўнай кропкай пераасэнсавання Вялікай гісторыі. Нам можа здавацца, што важнае (і гістарычна значнае) адбываецца дзесьці далёка, у вялікіх гарадах, з удзелам вядомых людзей. Але гісторыя пра вайну, расказаная бабуляй з суседняга дома, можа змяніць наш погляд на тое, што мы вывучалі ў школе. І на ўласную вуліцу, вёску, горад, краіну. Малое становіцца вялікім, нязначнае становіцца важным.
На працягу амаль трох месяцаў тэатр "Крылы халопа" рэалізоўваў праект "Гісторыі Беларусі. Вялікае Сяло", у межах якога праводзіў майстар-класы для дзяцей вёсак Вялікае Сяло і Ялова. На першым этапе дзеці збіралі гісторыі мясцовых бабуляў і дзядуляў, жыццёвыя асабістыя гісторыі пра вёску, вайну, людзей, немцаў, партызанаў, каханне, Кацярыну II... Пасля гэтага дзеці асвойвалі тэхнікі "тэатра ценяў" і story-telling, самі стваралі лялькі і сцэнаграфію, вучыліся рабіць музычнае афармленне спектаклю. Вынікам стаўся спектакль, на прэм'еру якога 10 жніўня запрашаюцца ўсе мясцовыя жыхары і госці "Прызба-фэсту".

Ролі выконваюць: дзеці Вялікага Сяла, Ялова

**16.45 - паказ выніку цыркавога майстар-класу з дзецьмі Вялікага Сяла ад тэатру Венгайты**
**17.00 - спектакль тэатру "Венгайты" (Польшча) «Зямля Б»**
**18.00 - адкрыты майстар-клас традыцыйнага танцу ад тэатру "Венгайты"**
**19.00 - сумесная вячэра з жыхарамі Вялікага Сяла.**

ПРЫЗБА- ФЭСТ: ТЭАТР. ЭКАЛОГІЯ. САЦЫЯЛЬНАЕ МАСТАЦТВА.

# Майстар-класы пад час Прызбы

"Ля-Нота" запрашае усіх у прастору крэатыўнага гультайства ў рытме SlOW. Прыемная атмасфэра, са смакам экзатычных напояў, гарнай кнігарняй, гульнямі й таямнічымі гукамі. У мясцовай майстэрні "RE-UP" можна паспрабаваць розныя тэхнікі друку, ці уласнымі рукамі надрукаваць сабе дызайн на кашулю, торбу альбо хустку.
**Кавярня дзейнічае кожны дзень пад час фэсту з 12:00 да 21:00.**
**Майстэрня друкуе кожны дзень з 11:00 да ночы.**
**Workshop у друкарні адбудзецца у суботу а 12:00 гадзіне.**

**Майстар-клас Жанны Панамарэнка: канфлікты.**
Канфлікты – амаль непазбежная частка любой дзейнасці. Творчая і праектная праца – ня выключэнні. На чым заснавана канфліктнасць? Як рэалізаваць канструктыўны патэнцыял канфлікту і навучыцца дамаўляцца? Як ня зневажаць іншых і не забыцца пра сябе. Што такое негвалтоўная камунікацыя і як ёй карыстацца? Майстар-клас прадугледжвае вялікую інтэрактыўную частку, дзе мы будзем працаваць над гэтымі і іншымі пытаннямі.
Жанна Панамарэнка – навукоўца, актывістка, праваабаронца (Мурманск). Тэматычная вобласць праектаў – ўзаемадзеянне ўлады і грамадства, сацыяльнае мастацтва і арт-актывізм, гендэр, сацыяльнае развіццё горада, працэс-арыентаваныя метады ў праектнай працы.
**Майстар-клас адбудзецца 10 жніўня. Пачатак у 11.00**

**Майстар-клас па асновах журналістыкі "Артыкул"**
З нас – аповед пра тое, як напісаць тэкст хутка і проста, якімі фатаздымкамі яго суправадзіць. З вас – стварэнне кароткіх навін аб "ПРЫЗБА-фэсце". Кожны дзень плануецца друк газеты фэста, які будзе складацца з напісаных намі артыкулаў. Можна будзе паспрабаваць сябе ў розных жанрах журналістыкі. Нават калі вы не плануеце займацца журналістыкай, майстар-клас будзе карысны пры напісанні тэкстаў у livejournal і сацыяльных сетках.
**Майстар-клас адбудзецца 8 - 10 жніўня. Пачатак у 11.00**

**Майстар-клас праекту КІНЕМО!!!**
На працягу трох дзён мы будзем шукаць новыя падыходы да агучвання нямога кіно разам з кампазітарамі Вольгай Падгайскай, Канстанцінам Яськовым, Віталем Эпавым, акардэаністам Аляксандрам Будзько.
Хто такі тапёр, сучаснае таперства, прычыны новай хвалі папулярнасці нямога кіно ў 21 стагоддзі, вывучэнне розных тэхнік агучкі фільмаў, сумеснае музіцыраванне.
Майстар-клас таперскага мастацтва прадугледжвае наяўнасьць пэўнай колькасці інструментаў, таму жадаючых паўдзельнічаць просім прыхапіць з сабой любы гулкі прадмет, будзь то піла, гелікон, гармонік або англійскі ражок- усё пойдзе ў справу.
Завяршэннем майстар-класа будзе сумесная агучка кароткаметражных фільмаў Бастера Кітана, паказ якіх адбудзецца 10 жніўня ў 23.00.
**Майстар-клас будзе праходзіць 8- 10 жніўня з 11.00 да 14.00**

**Майстар-клас па эка-дызайну ад Лены Штык: выраб вянкоў для ўпрыгожвання інтэр'еру.**
Трохі пра сімволіку вянка. Вянкі ва ўсе часы служылі як паднашэнне, дар са значэннем круга (даўгавечнасць, трываласць) пры аказанні ушанаванняў. Сімвал кальца злучаўся ў вянку з сімваламі зямных радасцяў і жыццёвай сілы раслін. Вянок часта з'яўляецца сімвалам перамогі над цемрай.
Прыходзьце, будзем майстраваць колы радасці! )
**Працуем 8 - 9 жніўня з 11.00**

ПРЫЗБА- ФЭСТ: ТЭАТР. ЭКАЛОГІЯ. САЦЫЯЛЬНАЕ МАСТАЦТВА.

Кантакты:
+375 295292219
+375 295251652
zalessie@gmail.com
krylyhalopa@gmail.com
www.zalessie.by
www.teatrkh.com

Каманда фэста:
Сяргей Сідарук – арганізацыя фэсту
Аксана Гайко – каардынатарка праграмы
Алена Штык – майстар-классы
Святлана Гайдалёнак – валантарыят, рэклама
Сяргей Гайко – лагістыка, тэхнічнае забеспячэнне
Андрэй Багданаў – гукарэжысер
Ганна Фёдарава – светавое забеспячэнне

Дызайн: Вета Вертэ
Тлумачэнне: Святлана Гайдалёнак, Юля Траццяк, Зміцер Піскур

Падзяка:
Велікасельская сярэдняя школа
Велікасельські мясцовы клюб

Фэст рэалізаваны пры падтрымцы:
праекту USAID, які рэалізуецца ПРААН "Мясцовае прадпрымальніцтва і эканамічнае развіццё" ў межах ініцыятывы "Павышэнне патэнцыялу суб'ектаў аграэкатурызму праз узаемадзеянне ў сумесным экалагічна-арыентаваным турыстычным прадукце ў рэгіёне Белавежскай пушчы"
тэатра Венгайты
Інстытута Адама Міцкевіча
Вялікасельскага мясцовага Савету
Пружанскага райвыканкаму

Арганізатары:
Брэсцкі Трансгранічны Інфацэнтар
Аграэкасядзіба "Залессе"
Тэатр "Крылы Халопа"

ПРЫЗБА- ФЭСТ: ТЭАТР. ЭКАЛОГІЯ. САЦЫЯЛЬНАЕ МАСТАЦТВА.




# ПРАГРАМА

**Пятніца, 8 жніўня, в. Залессе**
11.00 - 14.00 Майстар-класы
15.30 Адкрыццё выставы дзіцячага малюнка на тэму "Чарнобыль"
16.00 Дар'я Яскевіч: прэзентацыя "Дэвіянтнае мастацтва ў інтэрнатах Беларусі"
17.30 Прэзентацыя дакументацыі "Вытокі і будучыня" і "Караван поўдня" аб экспедыцыі тэатра Венгайты ў Албанію
20.30 дыскусія "Ці павінна мастацтва быць сацыяльным?" Мадэратар Вольга Шпарага
19.30 Вячэра з мясцовымі жыхарамі (чакаюцца спевы)
22.30 Фестываль КІНЕМО – першы ў Беларусі open-air фестываль нямога кіно і сучаснай музыкі. Фільм "Мая бабуля" (Грузія, 1929 г.)

**Субота, 9 жніўня, в. Залессе**
11.00 - 14.00 Майстар-класы
14.00 Прэзентацыя аграэкасядзібы "Залессе"
15.30 Жанна Панамарэнка: лекцыя "Дыскурс улады ў сучасным мастацтве"
17.00 Таня Арцімовіч: лекцыя "Гвалтам на гвалт, альбо Мастацтва з актыўнай грамадзянскай пазіцыяй"
19.00 Музычны праект "Андарак", канцэрт
21.00 Тэатр "Крылы халопа", спектакль "Працэс"
22.00 Дыскусія пасля спектакля
23.00 Фестываль КІНЕМО: Кароткаметражныя фільмы "Антракт" (Францыя, 1924г.) і "Падарожжа на Месяц" (Францыя, 1902г.)
24.00 Праект электроннай музыкі Pavel Ambiont & Solar Olga

**Нядзеля, 10 жніўня, в. Залессе**
11.00 - 14.00 Майстар-класы
22.00 Фестываль КІНЕМО: кароткаметражкі Бастэра Кітана. Граюць удзельнікі майстар-класу "Тапёрства"!
23.00 Джэм-сэйшн

<u>ДЗЕНЬ ВЯЛІКАГА СЯЛА</u>
**Нядзеля, 10 жніўня, Вялікае Сяло**
16.00 Дзіцячы спектакль на аснове рэальных гісторый Вялікага сяла."Аповеды з Вялікага сяла". Акторы: дзеці з Вялікага сяла!
16.45 Паказ выніку цыркавога майстар-класу з дзецьмі Вялікага сяла
17.00 Спектакль тэатра "Венгайты" (Польшча) "Зямля Б"
18.00 Адкрыты майстар-клас традыцыйнага танца ад тэатра "Венгайты" Запрашаем усіх!
19.00 Супольная вячэра з жыхарамі Вялікага сяла. Просім усіх жыхароў прынесці да агульнага стала любімую страву!

У праграме магчымыя змены

**ТЭАТР. ЭКАЛОГІЯ. САЦЫЯЛЬНАЕ МАСТАЦТВА.**

**8-10 ЖНІЎНЯ 2014 ЗАЛЕССЕ, ВЯЛІКАЕ СЯЛО**